УДК 811.161.3’373.2

# АНТРАПОНІМЫ Ў ТВОРАХ А. МАКАЁНКА

*Г.В. Карасёва* (МДУ імя А.А. Куляшова)
Навук. кір. ***А.М. Шубадзёрава***,
канд. філал. навук, дацэнт

У сучаснай беларускай антрапанімічнай сістэме кожны чалавек мае ўласнае імя, імя па бацьку, прозвішча. Сам тэрмін антрапонім – гэта любое ўласнае імя, якое можа мець чалавек або група людзей. Літаратура спрыяе папулярызацыі некаторых імёнаў, нарэдка тых, якія ўжо выйшлі з актыўнага ўжывання. Літаратурныя антрапонімы з’уляюцца асаблівым відам: яны ўнісаны ў пэўны кантэкст таго мастацкага твора, у якім ужываюцца. У залежнасці ад кантэксту літаратурны антрапонім можа набываць асаблівае значэнне, якое адрозніваецца ад звычайнага, звыклага.

Сапраўдным мастаком стварэння вобраза персанажа з дапамогай антрапонімаў з’уляецца А. Макаёнак. Так, напрыклад, у камедыі «Выбачайце, калі ласка» [1, с. 90–159] галоўныя героі носяць гаваркія прозвішчы: гэта Каліберaў, Моцкін, Печкуроў. Каб зразумець сэнс абрання аўтарам менавіта такіх прозвішчаў для сваіх герояў, мэтазгодна звярнуцца да вытокаў, слоў, ад якіх яны паходзяць.

Крыніцай паходжання прозвішча Каліберaў з’уляецца назоўнік *калібр* – 1. перан. Памер, велічыня, форма чаго-небудзь, 2. Вымяральны інструмент для праверкі размераў, формы вырабаў. Каліберaў – тыповы кіраўнік савецкага часу. Ён нібыта недзе ў баку, «вымяральны інструмент». Той, хто прымае вынікі, а не працуе на іх, што пацвярджаюць і сцэны з тэксту. Моцкін – яшчэ адзін персанаж у п’есе. Прозвішча ўтворана ад прыметніка *моцны* – 1. Які цяжка парваць, разбіць, зламаць і пад.; трывалы, 2. Надзейны, ўстойлівы, 3. Магутны, аўтарытэтны. Дзейнічае ён актыўна, нахрапіста. Менавіта Моцкін падштурхнуў Каліберава на махінацыі.

Багатыя на антрапонімы і іншыя творы А. Макаёнка, сярод іх трагікамічная гісторыя «Пагарэльцы» (Ухватаў), драма «Узыходы шчасця» (Дабратворскі), трагікамедыя «Трыбунал» (Калабок, Сырадоеў) і інш.

Такім чынам, у сваіх творах А. Макаёнак дастаткова мэтанакіравана выкарыстаў антрапонімы. Уласныя імёны не толькі ідэнтыфікуюць асобу персанажа, але могуць несці сацыяльную і ідэалагічную нагрузку, вызначаць героя, абумоўліваць яго характар і паводзіны.

## Літаратура

1. **Макаёнак, А.** Выбраныя творы : у 2 т. / А. Макаенак. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1980. – Т. I : П’есы. – 384 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова